**“Скарыніяна” (2011–2018 гг.)**

Вынікам навуковай работы стала стварэнне ў рамках электроннага каталога Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі калекцыі бібліяграфічных запісаў “Скарыніяна” (327 запісаў) з магчымасцю пошуку па любым полі і электроннай бібліятэкі лічбавых копій выданняў і рукапісных спісаў з кніг Францыска Скарыны, а таксама манаграфій і артыкулаў пра беларускага першадрукара. Калекцыя пачала фарміравацца з навуковага апісання і алічбоўкі выданняў і спісаў Ф. Скарыны з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Верхнялужыцкай бібліятэкі г. Гёрліца (Германія). Электронныя копіі кніг Ф. Скарыны паступілі з розных краін свету (Украіна, Расія, Літва, Вялікабрытанія і інш.) і сталі даступны даследчыкам ў чытальных залах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.